


ВЫБАР

ГАЗЕТА ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПЛЫНЯЎ ПРЫДЗВІНСКА- ПРЫДНЯПРОЎСКАГА КРАЮ


№ 28 (56) 25 жніўня—7 верасня 1993 г. Кошт 5 рублёў


25 ЖНІЎНЯ 1991 ГОДА ДЭКЛАРАЦЫЯ АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ СУВЕРЭНІТЭЦЕ НАБЫЛА СІЛУ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ЗАКОНУ. ГЭТАЯ ДАТА СТАЛА ДНЁМ АДРАДЖЭННЯ НЕЗАЛЕЖНАЕ РЭСПУБЛІКІ.

СА СВЯТАМ, СЯБРЫ!

У ГАЗЕЦЕ:

Наглядны кантраст наменклатурнага рынку





Непрадузяты фотааб'ектыў зафіксаваў гэтыя будынкі на двух суседніх вуліцах дачнага пасёлка, які раскінуўся на былых землях вугаса «Падбярэззе», на беразе Заходняй Дзвіны.

З аднаго боку, гэта дачы тых, хто на працягу многіх гадоў вёў нас па шляху «развітога сацыялізма», з другога— відавочна, удзельніка афганскай вайны (так растлумачылі нам старажылы). Дарэчы, гэта адна такая хатка, што згубілася там у моры наменклатурных катэджаў. У першых толькі адна праблема: як абыйсці суседа ў архітэктурных лішках, праблемы другога бачны з гэтага здымка.

Язэп КАЛЮЧКА.

Зварот Выканаўчага камітэта Цэнтральнай Рады БСДГ

ПАВАЖАНЫЯ СУАЙЧЫННІКІ!

Вялікая бяда абрушылася на паўднёвыя раёны Беларусі! Затоплена больш за тысячу жылых дамоў, пад вадой апынуліся лініі сувязі, дарогі, дзесяткі тысяч гектараў сельгасугоддзяў. У раёнах стыхійнага бедства амаль цалкам знішчаны ўраджай, павялічылася радыяцыйнае забруджанне, існуе магчымасць узнікнення эпідэміі, больш за 50 тысяч чалавек пастаўлены на мяжу выжывання.

Выканаўчы камітэт Цэнтральнай Рады БСДГ звяртаецца да сяброў і прыхільнікаў Грамады, да ўсіх палітычных і грамадскіх арганізацый, да грамадзян Беларусі і нашых суайчыннікаў за межамі краіны з заклікам прыняць удзел у аказанні дапамогі жыхарам пацярпеўшых раёнаў.

Выканкам ЦР БСДГ.

* * *

Выканаўчы камітэт Цэнтральнай Рады БСДГ прыняў рашэнне пералічыць 50 тысяч рублёў на ліквідацыю вынікаў стыхійнага бедства.

Рэзананс

Лекар знайшоўся!

Нядаўна «Выбар» (№ 23) пісаў аб нездавальняючым экалагічным стане ў дачным пасёлку Уланавічы.

10 ды 17 жніўня намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама У. Кічыгін сустрэўся з прадстаўнікамі садаводчых кааператываў дачнікаў. У гутарцы удзельнічалі супрацоўнікі гарСЭС, спецаўтабазы, якая займаецца вывазам смецця. Сп. Кічыгін запэўніў, што віцебскія ўлады будуць кантраляваць праблему ўборкі смецця з тэрыторыі лецішчаў.

А.Б.

Суд падтрымаў настаўніка

Ужо не першы год працягваецца канфлікт паміж настаўнікам гісторыі СШ № 3 Наваполацка П. Галынёй, з аднаго боку і тымі, хто на розных узроўнях кіруе ў горадзе народнай асветай. У чым толькі не абвінавачвалі Пятра Ягоравіча: і экзамены праводзіў не так, як трэба, і дысцыпліны на яго ўроках няма, і наогул, педагог ён дрэнны, бо разважае неяк нестандартна. Менавіта нетрадыцыйныя метады яго работы і членства ў Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі з'явіліся, як лічыць П. Галыня, сапраўднымі прычынамі пазбаўлення яго прэміі па выніках работы за год. Па цяперашніх мерках сума нязначная, але Пётр Ягоравіч мае намер да канца змагацца з бюракратамі, якія заселі ў сістэме народнай асветы. «Тут справа не ў грошах, а ў прынцыпах»,—гаворыць ён.

І вось на мінулым тыдні судовая камісія па грамадзянскіх справах Віцебскага абласнога суда разгледзела касацыйную скаргу П. Галыні і палічыла яе абгрунтаванай. Справа накіравана на новы разгляд у Наваполацкі гарсуд.

А. Я.


Аўтапарк у парку!

Парк імя Фрунзе знаходзіцца ў гістарычным цэнтры Віцебска. Па прылягаючых вуліцах штодзённа імчыць бясконцы паток аўтатранспарту. Таму паветра ў цэнтры горада даволі моцна забруджана выхлапнымі газамі. Здавалася б, трэба павялічваць тут колькасць зялёных насаджэнняў. Але атрымліваецца наадварот. За апошнія некалькі гадоў тэрыторыя парка, а значыць і зялёных насаджэнняў, няўхільна скарачалася. Спачатку камуністычная наменклатура вырашыла размясціць тут свой «штаб» і было распачата будаўніцтва вялікіх памераў гмаха новага абкама партыі. Але партыя развалілася, і цяпер у гэтым будынку— дыягнастычны цэнтр. А побач вырасла яшчэ большая будыніна—Палац культуры прафсаюзаў.

Знішчэнне парка працягваецца і ў нашы дні. На яго тэрыторыі будуюцца гаражы (гл. фота А. Лакоткі). Пры гэтым парушаецца зона ахоўнага ландшафту, гістарычнай забудовы, і археалагічны культурны слой, а таксама заканадаўства аб капітальным будаўніцтве.

Ці ведае, што робіцца ў парку, генеральны дырэктар аб'яднання паркаў Віцебска С. Вішнякоў, які па абавязку службы павінен клапаціцца пра захаванне і развіццё паркавай гаспадаркі горада? Што думае на гэты конт вышэйстаячае начальства з гарвыканкама? Ці ўдасца спыніць знішчэнне парка?

А. ЯСНЫ.



Паважаныя віцябляне!

8 верасня а 18 гадзіне на плошчы Волі адбудзецца святкаванне Дня беларускай вайсковай славы—479-й гадавіны перамогі ў бітве пад Оршай.

Аргкамітэт.

СІМВАЛ ЯДНАННЯ

Шмат часу прайшло пасля з'езду беларусаў свету, але сродкі масавай інфармацыі працягваюць каментаваць ягоныя вынікі.
Сваімі меркаваннямі пра грандыёзную імпрэзу ў жыцці краіны дзеліцца наш пазаштатны карэспандэнт.

Бадай, ніколі яшчэ ў гісторыі не збіралася такой сябрынай беларуская эліта. З'езд віталі Васіль Быкаў, Станіслаў Шушкевіч, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, прадстаўнік беларускае дыяспары Аргенціны і Аўстраліі, Бельгіі і ЗША, Канады і Францыі, Польшчы і краін былога СССР. Цікавае назіранне: усе прысутныя пачуваліся як адна сям'я. Асабліва гэта было відаць, калі ўсе, стоячы, спявалі беларускі гімн:

Мы выйдзем шчыльнымі радамі
На родны, вольны свой прастор!

Тут здавалася, што зала—увогуле адзіны арганізм.

Усе дадзеныя пра колькасць беларускае эміграцыі, славутых яе прадстаўнікоў і ўдзел у беларускіх імпрэзах фіксуюцца Беларускім інстытутам Навукі і Мастацтва ў Нью-Ёрку. Прысутны на з'ездзе дырэктар БІНіМу і аўтар папулярнай кнігі «Беларусы ў ЗША» сп. Вітаўт Кіпель, азнаёміўшыся з «Выбарам», пажадаў поспехаў чытачам газеты:

Шаноўным землякам зь Віцебшчыны з найлепшымі пажаданьнямі з шчырасьцю
Вітаўт Кіпель
Жыве Беларусь!
Менск, ліпень, 1993

Калі апісваць з'езд, пільнуе небяспека заблытацца ў дэталях, а то і спажыць увесь ліміт газетнае плошчы. Напісаць арыгінальна і сцісла—цяжка, бо надта маштабнае мерапрыемства, прадстаўнічае і багатае на ўражанні.

Падчас з'езду былі праведзены круглыя сталы па актуальных тэмах. Што да канкрэтнай дапамогі нашых замежных суайчыннікаў, на якую шмат хто ўскладаў надзеі... Ва ўсялякім разе, пра вынікі гэтае дапамогі яшчэ казаць заўчасна. Не такая ўжо шматлікая і ўплывовая беларуская эміграцыя, каб істотна палепшыць стан нашае эканомікі, і не настолькі жвавыя нашы ўлады, каб гэтую дапамогу скарыстаць. Спадзявацца мусім перадусім на саміх сябе. У прамове сп. Янкі Запрудніка (ЗША) прагучала слушная думка, што мы, беларусы—народ разумны і працавіты, але нам бракуе прадпрымальнасці. Трэба вывучаць замежныя мовы і пашыраць інфармацыю, бо ў свеце Беларусь пакуль што мала вядомая. Гандляваць трэба не адно калійнай соллю, але і прадуктамі свае працы, як гэта і належыць краіне з навукова-ёмістай эканомікай. Абавязкова трэба скарыстаць абвешчаны ЗША статус найбольшага спрыяння і прыхільнасць іншых краін Захаду да Беларусі. Трэба, нарэшце, удасканальваць заканадаўства, бо менавіта на яго, а не на афіцыйныя заявы, глядзяць найперш заходнія бізнесмены. Тут прамоўца згадаў выпадак з наймалодшым сынам знакамітага мовазнаўцы сп. Богумілам Станкевічам. Калі той, наведаўшы Віцебск з гуманітарнай дапамогай, і, уражаны майстэрствам тутэйшых мастакоў, набыў дзесяць абразоў, то не здолеў вывезці іх дадому. Так і пакінуў на мытні, заблытаўшыся ў бюракратычных цянётах.

Дапамагчы хутчэй можам мы нашым суайчыннікам літаратурай (асабліва падручнікамі для беларускіх школ), мэтавым прыёмам абітурыентаў у беларускія ВНУ, арганізацыяй тэле- і радыёперадач. Гэта рабіць трэба неадкладна, бо з прычыны слабое сувязі з метраполіяй большая частка ўжо другое генерацыі эмігрантаў не гаворыць па-беларуску.

Прыкры выпадак, сведкам якога надарылася быць. Напярэдадні запланаванага ў праграме з'езду канцэрта бардаўскай песні ў Доме літаратара амерыканец ірландскага паходжання звярнуўся да прысутных з нагоды свайго візіту і дастаўкі гуманітарнае дапамогі. «Мы шмат у чым падобныя, беларусы і ірландцы»,—казаў ён гэта па-англійску і адначасова скардзіўся на англійскую каланізацыю, што прывяла да заняпаду мовы яго нацыі. Недарэчнасць моманту была і ў тым, што да замежнага госця прыставілі адвочна слабую перакладчыцу, якая перакладала... на рускую мову.

Так што нашая дапамога мае быць неадкладнай. Іначай, як невясёла пажартаваў адзін з удзельнікаў з'езду, захаваць нашу эміграцыю ад асіміляцыі можна толькі новай хваляй эміграцыі. Вядома ж, аснова ўсялякае дапамогі і ўвогуле плённае дзейнасці—асабістыя кантакты. У гэтай сувязі такая міжнародная сустрэча была край неабходнай. Згода застаецца ў памяці нашага грамадства як **сімвал** яднання ўсіх беларусаў незалежна ад краіны пражывання, узросту, прафесіі і палітычных поглядаў.

Уладзімір СЛАБІН.

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

Заўважана, што ў эпохі пераломныя, лёсавызначальныя для народаў, на гістарычныя арэны выходзяць постаці тытанічныя, маштабныя. Прыгадайма пачатак 20-га стагоддзя. Такімі былі Антон Луцкевіч, Вацлаў Ластоўскі, Браніслаў Тарашкевіч. У канцы бягучага стагоддзя, калі на карту зноў пастаўлены лёс Беларусі, гісторыя падаравала нам асобу, якую сёння можна паставіць упоравень з бацькамі нацыянальнага Адраджэння. Гэта Міхась Аляксандравіч Ткачоў. Бліскучы гісторык, дальнабачны палітык, таленавіты арганізатар, урэшце—тонкі майстра слова, якому былі аднолькава падуладны і чары красамаўства, і энергія слова пісьмовага. І да ўсяго да гэтага—чалавек вялікай душэўнай шчодрасці і абаяльнасці.

Прырода шчодра надзяліла Міхася Ткачова. І як гэта часта здараецца, за свае высілкі, відаць, непамерныя, мусіла спатрабаваць і плату. Самую што ні ёсць вялікую—плату жыццём. Ткачоў пайшоў ад нас у самым росквіце сваіх інтэлектуальных і творчых магчымасцей, так і не паспеўшы ўдостаць наталіць смагу па Беларусі вольнай і незалежнай.

Зараз прыйшла наша чарга—яго паплечнікаў, аднадумцаў, нашчадкаў—сплачваць, доўг, аддаваць належнае памяці гэтага вялікага чалавека. Каб тыя, хто прыйдуць пасля нас, ведалі духоўных лідэраў нацыі, сталі спадкаемцамі іх ідэй. Бо калі захаваецца пераемнасць пакаленняў, народ зможа выстаяць у самых найскладанейшых варунках гісторыі.

9 ліпеня ў Мсціславе, на радзіме Міхася Ткачова, была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар славутага земляка. З'явілася яна на будынку, у якім з 1949 да 1959 года ён вучыўся (вул. Савецкая, 10). Зараз там месціцца прафесійна-тэхнічнае вучылішча будаўнікоў. Трэба аддаць належнае мясцовым уладам, якія ў даволі сціслы тэрмін і за сродкі мясцовага бюджэту (а дошка каштавала ні многа ні мала—400 тысяч рублёў, грошы немалыя для раённага аддзела культуры) змаглі арганізаваць гэту важную для ўсіх нас дзею. Хіба толькі дзень для гэтага быў выбраны не вельмі ўдала, бо многія вядомыя грамадска-палітычныя дзеячы, прадстаўнікі навукі і культуры, што меліся прыехаць на ўшанаванне памяці Міхася Ткачова, былі заняты на Першым з'ездзе беларусаў свету.

Мітынг з нагоды адкрыцця дошкі распачаў і вёў старшыня гарсавета Мсціслава М. І. Бухалка. Цёплыя словы пра земляка сказаў намеснік старшыні райвыканкама І. І. Карпечкін,



які добра ведаў М. Ткачова асабіста. Ён жа і адкрыў мемарыяльную дошку. Успамінам пра школьныя гады будучага грамадска-палітычнага дзеяча, яго ранніх зацікаўленні гісторыяй падзяліўся класны кіраўнік, настаўнік гісторыі Ю. З. Нікіцін. Цікава, што ён таксама вучыў другога вядомага гісторыка, дэпутата Вярхоўнага Савета Беларусі, цяперашняга старшыню БСДГ Алега Трусава, які родам з Мсціслава. Слова пра Ткачова-палітыка, заснавальніка Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады і яе першага старшыню сказаў пісьменнік, літаратуразнавец, член Выканаўчай Рады БСДГ Анатоль Сідарэвіч. Прамоўца асабліва падкрэсліў, якім вялікім аўтарытэтам карыстаўся Ткачоў у асяроддзі міжнароднай сацыял-дэмакратыі, сярод сваіх палітычных апанентаў.

Аб працягальнай сіле Ткачова-палітыка сведчаць усе новыя і новыя шэрагі Грамады—на сённяшні дзень адной з самых шматлікіх і ўплывовых партый на Беларусі. Каб ушанаваць памяць свайго палітычнага лідэра, у Мсціслаў прыехала цэлая дэлегацыя ад Магілёўскай абласной філіі БСДГ. У сваім слове яе старшыня Алесь Сердзюкоў гаварыў пра высокія маральныя якасці Міхася Ткачова, яго сапраўднае рыцарства і шляхецкасць.

Памятаюць пра Міхася Аляксандравіча і ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя», дзе ў апошнія гады свайго жыцця ён працаваў. Спачатку—загадчыкам рэдакцыі гісторыі, а потым—і галоўным рэдактарам. Праз некалькі месяцаў пабачыць Свет 1-ы том «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі»—дзецішча Ткачова, дзеля якога ён і пераехаў з Гародні ў Менск. На падыходзе і энцыклапедыя «Археалогія і нумізматыка Беларусі», асноўная праца над якой вялася пад яго кіраўніцтвам. Падрыхтавана і хутка будзе здадзена ў набор кніга публіцыстыкі М. Ткачова. Пра ўсё гэта гаварылася ў выступленні загадчыцы рэдакцыі народнай асветы і беларускіх слоўнікаў БелЭн Тамары Кароткай.

Падзяліўся сваімі ўражаннямі пра сустрэчы з М. Ткачовым член СП Беларусі, ураджэнец Мсціслава Алег Ждан. Адной з вызначальных рыс свайго земляка пісьменнік назваў здольнасць кансалідаваць, яднаць вакол сябе людзей, часам нават розных палітычных поглядаў. Сведчанне гэтаму—стварэнне ў Менску Мсціслаўскага зямляцтва, душой якога быў М. Ткачоў.

Са словамі ўдзячнасці ад родных і блізкіх на мітынгу выступіў Алесь Каралёў. Дарэчы, сябра Жодзінскай гарадской філіі БСДГ.

Глыбокую пашану да свайго славутага земляка засведчылі мсціслаўцы не толькі адкрыццём мемарыяльнай дошкі. Імем Міхася Ткачова названа адна з вуліц горада, якая раней насіла назву Дружная. І яшчэ. Мясцовыя ўлады выношваюць ідэю стварэння ў Мсціславе гуманітарнага ліцэя ці гімназіі. Нешта накшталт Беларускага гуманітарна-адукацыйнага ліцэя ў Менску, ля вытокаў якога стаяў М. Ткачоў. Грунт для гэтага ёсць. Некалі ў Мсціславе быў вядомы на ўсю рэспубліку педтэхнікум, у якім вучыліся А. Куляшоў, З. Астапенка, Ю. Таўбін, працаваў дырэктарам вядомы мовазнаўца І. Бялькевіч. Дзейнічала тут і філія «Маладняка». Значыць, не на пустым месцы будзе ўзведзены гмах новай навучальнай установы, выхаванцам якой, верую, належыць адыграць выключную ролю ў нацыянальным адраджэнні Мсціслаўшчыны, а можа, нават і ўсёй Бацькаўшчыны. Бо асвечана яна будзе імем Міхася Ткачова, паходняй яго вялікага і мудрага сэрца.

Т. К.

Што за фірмы!

Амаль цэлы паверх займаюць у будынку Віцебскага абласнога ўпраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва малыя (і не толькі) камерцыйныя прадпрыемствы «Нева», «Уніус», «Пік» і г. д. Калі карэспандэнт «Выбара» прапанаваў прадстаўніку аднаго з іх напісаць на старонках газеты пра дзейнасць МП (значыцца, зрабіць бясплатную рэкламу), той рашуча адмовіўся. Што б гэта магло значыць?

На пытанне: «Вы арэндуеце гэтае памяшканне?» пачуў сцвярджальны адказ.

І ўсё ж такі дзіўна: чаму гэты камерсант адмовіўся ад дармавой рэкламы? Няўжо МП займаюцца нейкай сакрэтнай справай? Можа, тлумачэнне на гэты конт дасць начальнік УБАН Ю. Галыкін?

А. БУКАЧОЎ.

Прадаецца марксізм-ленінізм

Пры ўваходзе ў Віцебскую цэнтральную гарадскую бібліятэку наведвальнікаў сустракае аб'ява, якая паведамляе, што гэтая ўстанова прадае сярод іншай літаратуры творы Маркса, Энгельса, Леніна. Цана—па дамоўленасці. Ваш карэспандэнт вырашыў даведацца, за колькі можна набыць сёе-тое з напісанага заснавальнікамі «вечна жывога» вучэння. Збор твораў Маркса і Энгельса мне прапанавалі рублёў па 20—30 за том. Ленін у 45 тамах—рублёў па 50 за кнігу. Як бачым, адзін ленінскі том каштуе значна танней томіка Чэйза або Гарысана. Кажуць, сапраўдную цану ўсяму вызначае час. Пэўна, наша постперабудовачная эпоха з'яўляецца вызначальнай у адносінах да сапраўднага рыначнага кошту марксісцка-ленінскіх ідэй.

А. Б.

Вакол культурна-рэлігійнага жыцця

Камуністы паверылі ў бога?

Рэдакцыі трапіўся ў рукі цікавы дакумент з назвао «Перспектыўны план рэстаўрацыі й прыстасавання помнікаў архітэктуры на дванаццатую пяцігодку ды на перыяд да 2000 года» (камуністы марылі панаваць як мінімум да XXI стагоддзя). На ім пазначана: «Зацверджаны рашэннем выканкама абласнога Савета народных дэпутатаў ад 20.07.87 № 317».

Як жа планавалі камуністы выкарыстоўваць помнікі архітэктуры Віцебшчыны (а гэта ў асноўным культавыя пабудовы) пасля іх рэстаўрацыі? У розных мэтах, але толькі не па прамому прызначэнню. Напрыклад, у будынку Дабравешчанскай царквы аддзел культуры гарвыканкама меркаваў адкрыць музей, у Пакроўскай—карцінную галерэю, у касцёле св. Варвары—канцэртную залу. Гэта ў Віцебску. А, накрыклад, у Полацку ў будынку царквы планавалася адкрыць планетарый, на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра—кемпінг. У касцёле ў вёсцы Росіца Верхнядзвінскага раёна кіраўніцтва хацела зрабіць спартыўную залу, у храме вёскі Празарокі на Глыбоччыне—музей тэатральнага мастацтва і канцэртную залу. Канцэртнымі заламі павінны былі стаць таксама царква Куцеінскага манастыра ў Оршы, касцёлы ў Лепеле і Паставах.

Прайшло ўсяго некалькі гадоў, і планы рэзка змяніліся. Цяпер усе вышэй названыя і многія іншыя культавыя будынкі перададзены вернікам і выкарыстоўваюцца па свайму прамому прызначэнню. Добра, што Савецкая ўлада хоць у нейкай ступені спрабуе вярнуць даўгі вернікам, бо поўнасцю іх аплаціць немагчыма—вельмі ж шмат знішчана за семдзесят гадоў. Паступова адраджаецца і адродзіцца духоўнасць, вера ў адвечныя ідэалы дабра, любові, спагады да бліжняга.

Здзіўляе толькі адно: чаму так змяніліся планы кіраўніцтва? Сёння ва ўладзе—тыя ж самыя людзі, што зацвярджалі 5 гадоў назад вышэй названы дакумент. Яны толькі павыкідвалі партбілеты, ды і то не ўсе гэта зрабілі. Атрымліваецца, што камуністычная наменклатура, якая яшчэ зусім нядаўна вызначалася ваяўнічым атэізмам, зараз раптам дружна змяніла свае адносіны да рэлігіі. А можа, тыя, хто намі кіруе ў розных выканкамах, не вераць і ніколі не верылі ў ні ў камунізм, ні ў Бога, ні ў чорта? Можа, ім усё роўна, на каго маліцца—на Леніна, Хрыста ці Алаха? Падзеі апошніх гадоў пацвярджаюць, што гэта менавіта так. З-за абыякавасці большасці народа тон у нашым грамадстве і дагэтуль задаюць людзі беспрынцыпныя і амаральныя. Учора яны абгрунтоўвалі свае дзеянні цытатамі з твораў класікаў марксізма-ленінізма, сёння ў сваіх дакладах і выступленнях спасылаюцца на Біблію. Нядаўна сцвярджалі адно, цяпер—зусім адваротнае. Як можна верыць ім? Канечне ж, большасць нашых суайчыннікаў даўно з імі не згаджаецца, але маўкліва наглядае за іх хамелеонствам, баючыся што-небудзь зрабіць ці сказаць насуперак іх волі, бо ў «хамелеонаў»—улада.

Што ж, як кажуць, Бог усё бачыць. Ён заклікае усіх людзей пакаяцца без уліку зямной улады. Гэта павінна быць шчырае пакаянне. Ды бяда ў тым, што цяпершаняе кіраўніцтва да ўсяго ставіцца бюракратычна бо сфармавалася ў адпаведных умовах і, як мне здаецца, не здольнае шчыра пакаяцца ў сваіх грахах перад народам ды Богам.

А. ЯСНЫ.



У Слоніме, пасля шматгадовых дэбатаў мясцовых уладаў ды рэстаўратараў завяршаецца адраджэнне аднаго з шэдэўраў беларускага барока—касцёла святога Андрэя. Справа ў тым, што пры адносна добрым знешнім стане помніка, яго лічылі асуджаным, бо бязглуздая воля мясцовых камуністычных уладароў ператварыла храм у... склад селітры, якая за доўгія гады літаральна «з'ела» ніжні ярус яго муроў.

Вярнуць «здароўе» шэдэўру дапамаглі спецыялісты з Варшавы ў той час, як свае «дабрадзеі» (вядома ж, каб не збяднець ад добрае справы) настойвалі на зруйнаванні "безнадзейнага" касцёла.

Па мастацкіх якасцях са св. Андрэем у адным шэрагу стаяў і віцебскі шэдэўр—славутая Уваскрасенская царква, падмуркі якое да гэтае пары ніяк не здолеюць адкапаць мясцовыя археолагі. Калі ўспомніць нядаўні дабрачынны збор «Тэатральнага марафону», сродкаў на добрую справу хапае, але традцыйна недзе ды штосьці «муляе» ды не дае зрушыцца з месца гарадскім уладам Віцебска. Вядома ж, стваральная воля у нас заўсёды саступала волі разбуральнай. Няведама, якія «аргументы» сцёрлі Уваскрасенку з твару горада ў 30-я, але, відаць, тактыка віцебскіх варвараў ад улады была больш дасканалая за тактыку слонімскіх.

Алесь МЕМУС.

На здымку: касцёл св. Андрэя ў Слоніме да рэстаўрацыі.

Фота аўтара.

Замест кіно— выстава-продаж

На чатыры дні перапыняецца дэманстрацыя фільмаў у віцебскім кінатэатры «Беларусь». З 30 жніўня па 2 верасня ўключна камерсанты праводзяць тут выставу-продаж аўтамабіляў. Паколькі на гэты тэрмін прадпрымальнікі арэндуюць найбуйнейшы кінатэатр горада, магчыма, нейкая карысць ад гэтага мерапрыемства будзе і «Беларусі».

А. БУКАЧОЎ.

Ёсць такая нацыя

Запомніліся мне словы старшыні Ходцаўскага сельскага Савета народных дэпутатаў Алега Ягоравіча Бохана, які неяк заўважыў:

—Хочаш адчуць сябе беларусам—зайдзі ў Ходцаўскую бібліятэку...

Сапраўды, загадчыца сельскай бібліятэкі ў вёсцы Ходцы Сенненскага раёна Ларыса Уладзіміраўна Паражынская вельмі многае робіць па прапагандзе беларускай кнігі, роднай мовы, культурнай спадчыны. Можа і не варта пералічваць мерапрыемствы, якія яна праводзіць у гэтым напрамку. Адзначу толькі, што яны шматлікія і разнастайныя.

А ў цэлым жа ўражанне па раёну такое, што выкананнем Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» займаюцца толькі аддзелы культуры і народнай асветы, ды яшчэ аддзел запісу актаў грамадзянскага стану.

Нядаўна прэзідыум Сенненскага раённага Савета народных дэпутатаў абмеркаваў пытанне аб выкананні Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь». Было адзначана, што вельмі ўжо марудна прыжываецца родная мова ў дзейнасці сельскіх Саветаў. Не стала яна пакуль што тут рабочай. Пратаколы сесій і пасяджэнняў выканкамаў пішуцца таксама па-руску. А пра іншыя арганізацыі і ўстановы і гаварыць не варта. У іх няма нават зрухаў да адраджэння роднай мовы.

Што ж тут асаблівага, калі нават адзін з членаў прэзідыума дужа весяліўся, слухаючы інфармацыю па гэтаму пытанню, якая, вядома ж, рабілася па-беларуску. Гэта быў Іван Васільевіч Траян, былы старшыня былога раённага камітэта народнага кантролю, цяпер пенсіянер. Яму была зроблена заўвага, што закон аб мовах трэба выконваць, што неабходна пераходзіць да таго, каб ва ўстановах і арганізацыях, у іншых калектывах рабочай мовай была беларуская. А дома, увогуле ў быце, ён можа размаўляць, як хоча.

—І «чорны варанок» ноччу за вамі не прыедзе,—слушна заўважыў другі член прэзідыума, дырэктар саўгаса імя П. М. Машэрава Мікалай Лявонавіч Цуран.

Гэта так, сілай вывучаць беларускую мову ніхто нікога не прымушае. Але кіраўнікі, адказныя работнікі, безумоўна, павінны валодаць дзяржаўнай мовай у аб'ёме, неабходным для выканання службовых абавязкаў. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў пастанове, якую прыняў прэзідыум.

Праўда, трохі ніякавага ад усведамлення таго, што большасць кіраўнікоў на Сенненшчыне з'яўляюцца мясцовымі ўраджэнцамі, карэннымі беларусамі, і яны не умеюць, не хочуць, саромяцца роднага слова.

Доўгі час нашы камуністычныя ідэолагі даказвалі, што беларусы—гэта сапраўдныя інтэрнацыяналісты, самая інтэрнацыяналістычная нацыя. І дабіліся многага—ледзьве не знішчылі родную мову, культуру. Назаўсёды запомніцца славуты прафесар Абэцадарскі, які на лекцыях задаваў нам, студэнтам факультэта журналістыкі, пытанне: «Якая нацыя будзе пры камунізме?» і сам жа адказваў: «Камуністычная». У многіх з нас засела ў галаве, што размаўляць па-беларуску, значыць быць працаўнікам пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Ды, мусіць, не так гэта. Сапраўдны інтэрнацыяналіст не той, хто сароміцца свайго паходжання, сваёй мовы, сваіх спрадвечных каранёў. Сапраўдны інтэрнацыяналіст той, хто і ў думках, і ў справах застаецца гуманістам.


Мы не павінны забываць, што ёсць такая мова, такая культура, такая нацыя—беларускія. Тады і будзе такая дзяржава—Рэспубліка Беларусь, а не «Северо-Западный край» і не «Крэсы Всходне».

І. ЛАЗУКА.


«LIBERTAS»—Свабода

Ужо не першы тыдзень у абласным навукова-метадычным цэнтры экспануецца выстава Андрэя Вярэніча «LIBERTAS», што значыць «свабода». Выстава адлюстроўвае выразную незалежніцкую пазіцыю мастака, старшага выкладчыка кафедры мастацкага праектавання Віцебскага тэхналагічнага інстытута, сакратара Віцебскай філіі Згуртавання Беларускай Шляхты. Для А. Варэніча незалежнасць Беларусі на першым плане, адсюль—назва выставы. Экспазіцыя твораў мастака будзе адкрыта да пачатку верасня.

Фота А. ЛАКОТКІ.



«Агонія».



«Апошні акорд імперыі».

Віцебскія палітычныя дыялогі

—Скажыце, колькі ў вашым горадзе базараў?

—Тры. Полацкі, Смаленскі і «Славянскі».

* * *

У старшыні калгаса «Шлях камунізму» запыталі:

—Чаму гэта Вашы калгаснікі сталі такімі сумнымі-сумнымі?

—Здаецца, яны зразумелі, што гэта іх апошні шлях.

Вясёлы глобус

—Тата, паглядзі дзённік!

—І табе не сорамна паказваць мне гэтыя двойкі і адзінкі?

—Не, тата, не сорамна. Гэта ж твой дзённік, я знайшоў яго на гарышчы.

***

—Якая розніца паміж аслом і канём?

—Некаторыя аслы сядзелі на канях, а вось каня на асле яшчэ ніхто не бачыў.

Наступны нумар выйдзе 8 верасня.

АБ'ЯВЫ

Мяняю трохпакаёвую куткавую кватэру палепшанай планіроўкі (49 кв. м), з тэлефонам, 9 паверх 10-цепавярховага дома ў раёне «Поўдзень-5» на двух- і аднапакаёвую або на дзве двухпакаёвыя па дамоўленасці. Тэл. 1-75-16.

***

Прадаецца праявіцель для чорна-белай плёнкі ў заводскай упакоўцы. Тэл. 36-10-59 (пасля 13.00).

***

Тэрмінова прадам керамічную цэглу (7 тыс. штук—60 тыс. руб. за тысячу). Тэл. 91-57-87.

Бясплатныя аб'явы. Тэл. 37-28-44.

ПАЭТЫЧНЫМ РАДКОМ

Дана Эрн

Сатанинские советы Вступающему на царствование

Верой истинной люди сильны. Отнимай эту веру и властвуй.
Подмени людям правду на ложь, а заметят немногие—царствуй!
Верить надо во что-то, а истинный путь слишком сложен—
большинство и пойдёт за тобой, лишь с «немногими» будь осторожен.

Разрушать—не творить. Разрушай же, пока удаётся.
Отнимаешь святыню—неведенье им остаётся,
а во мраке любой огонёк им покажется светом.
Так прислушайся, милый дружок, к сатанинским советам.

* * *

К.И.В.

Для чего ты пытался словами о камне сказать?
Невозможно рассказывать музыку—ты это знаешь,
невозможно картину словами заставить ожить,
невозможно слепцу объяснить многоцветие мира.
Для чего же о камне словами пытался сказать?
Промолчи. Каждый видит своё. Ну, а если не видит?—
слов не надо, молчи, камень сам говорит,—
научись только слушать.

Іван Лазука

Данчык

Як нацешыцца песнямі шчырымі,
Я аб тым расказаць не бяруся,
Толькі сёння няхай ён у вырай,
Ен жа наш, ён адсюль, з Беларусі.

Ен няхай у далёкай Амерыцы,
Дзе як усё на чароўным абрусе.
Толькі ў гэта зусім мне
не верыцца,
Ен жа наш, ён адсюль, з Беларусі.

Ен адсюль, дзе Дзвіна плешча
хвалямі,
Дзе цудоўныя краскі ў лузе,
Як і я, захапляецца долямі,
Ен жа наш, ён адсюль, з Беларусі.

Голас, поўны чароўнаю сілаю,
Як пачуеш, адкуль быць тут скрусе?
Ты вярніся да нас хутчэй з выраю,
Бо ты наш, ты адсюль, з Беларусі.

* * *

Хрыста распялі...
Інакш быць не магло—
Сярод сяброў
Шукайце ворагаў сваіх.
На чалавецтва
Плямаю лягло
І здрадніцтва,
І адрачэнне іх.

У чалавечнасць
Веры ўжо няма,
Яе ў нас
Даўно ўжо адабралі,
Шукаць яе
Даўно ўжо дарма,
Сябры-апосталы
Ей здрадзілі
І, як Хрыста,
Распялі.

Агні залатыя

Вы бывайце, агні залатыя,
Расставанне прыйшло к нам не ў час,
І да самай апошняй вярсты я
Азірацца ўсё буду на вас.

І калі далягляд вас закрые,
Буду помніць, што ў цемры начной
Ззяюць недзе агні залатыя
За гадоў, кіламетраў сцяной.

Што ж, бывайце, не гасніце толькі,
Клічце, вабце, завіце к сабе,
Колькі жыць яшчэ буду я, столькі
Бляск ваш сэрца маё зберажэ.

Ірына Ігнаценка

Усё мне дадзена ад Бога:
Каханьне, смутак ды туга,
Ды шлях жыццёвы, ды дарога,
Якой ісьці павінна я.

Спакуса дадзена ды слёзы,
Ды паратунак ад бяды,
Ды пах вясновае бярозы,
Ды падлічоныя гады.

Бяда са шчасьцем напалову,
Ды кожны добры чалавек,
Ды матчын боль, ды яе мова,
Ды глыбіня азёр і рэк.

З удзячнасьцю я ўсё прымаю,
І моўчкі крыж свой пранясу.
За ўсё, што прыйдзе і што маю,
Падзяку Госпаду нясу.

Возера

Якое возера прыветнае!
Застацца тут бы назаўжды.
І, безумоўна, яно ведае,
У чым грэшны ты і вінны ты.

У расе гасцінны бераг ранішні,
Скінь чаравікі на хаду,
І зачараваным застанешся,
Зглядзеўшы сонную ваду.

А скруху кінь, забудзь на беразе,
Душы прастор цяпер які!
І возера ўсёй шчодрай мераю
Адпусціць усе твае грахі.

* * *

Гарадкі мае ціхія,
Сціплыя цэнтры раённыя,
Вашы вуліцы мне знаёмыя,
Носяць вуліцы назвы гучныя.
Кім жа гэта ўсё так закручана?
Сянно, Докшыцы, Бешанковічы,
Не патрэбна мне вашай споведзі.
Жыццё вашае, ох, не простае,
Стрэчы рэдкія, усё ростані.
У парках ліпы ўсё, ды з таполямі.
І люблю я вас з вашай доляю.

Мікола Спаткай

Сыну

Прабеглі мклівыя гады.
І варта, часам, азірнуцца,
У думках завітаць туды—
К пачатку самаму вярнуцца.

Надзеі клікалі, вялі
І ў сэрцы полымем гарэлі,
Але не ведаў ты, калі
І дзе жыцця сустрэнуць мелі,

Каменняў здрадныя платы
І хціўцаў подлыя спадманы...
Удзячны лёсу я, што ты
Дабру, спагадзе быў адданы,

Што не скрывіў душой, калі
Спакусай клікалі на ўзбочча...
Ды мкненні добрыя жылі—
З людзьмі не сорам сёння
крочыць.

І ў гэты дзень табе я, сын,
Здабытак, выверны сэрцам,
Зноў зычу несці да вышынь,
З людской павагаю сустрэцца...

Павел Несцяронак

Хрыстос уваскрос

Хрыстос ваісціну ўваскрос
ці зноў яму рыхтуе Юда
крыж на Галгофе ў поўны рост?
Хачу ў святое верыць цуда.

Вось-вось асвеціцца сулад
узнёслых слоў і спраў высокіх.
Да праўды робім першакрокі.
Вось Вера толькі б ажыла.

Няхай не ў Бога. А ў Хрыста,
Праз вусны вершатворца Блока
Ісус Кастрычнік наш вітаў.
Хоць, можа, потым грыз ён локці...

Пад кліч «Ура!»... і... ў «Бога-маць»
мы на чале з бальшавікамі
не будаваць пачлі. Ламаць
людскія лёсы, храмаў камні.
Сваім шляхом папераў. Пром.
Ды покуль коцімся не ўгору.
Злачынца быў праведнікам.
Пад страхам хто знаў грэх і сорам?!

Праклён Галгофам і Гулагам!
За праўду сёння косцьмі лягу
ці пеклы турм праўду наскрозь.
Хрыстос ваісціну ўваскрос!



Заснавальнік

Віцебскі гарадскі клуб выбаршчыкаў «За дэмакратычныя выбары»

●

Галоўны рэдактар Барыс ХАМАЙДА

●

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Валянцін АРЛОЎ
Хрыстафор ЖАЛЯПАЎ
Васіль ІГНАЦЕНКА
Юры ЛАЎРЭНАЎ
Ларыса МІХНЕВІЧ
Міхась ПАЎЛАЎ
Уладзімір ПЛЕШЧАНКА
Леанід ТАМАРОВІЧ
Ігар ЦІШКІН

Мастак **Р. Клікушын.**
Фотаздымкі **М. Міхайлава.**
Адрас рэдакцыі: 210601, м. Віцебск, вул. Гогаля, 17.
Тэл. 37-35-06, 37-28-44.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор ды дакладнасць пададзеных фактаў, цытатаў, гаспадарча-статыстычных даных, уласных імёнаў, геаграфічных назваў і іншых звестак. А таксама за тое, што ў матэрыялах пададзены звесткі, якія з'яўляюцца дзяржаўнай ці спецыяльна ахоўваемай законам таямніцай.

Рэдакцыя можа апублікаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункт гледжання аўтара.

Пры перадруку спасылка на «Выбар» абавязковая.

Рукапісы не вяртаюцца й не рэцэнзуюцца.

Бягучы рахунак рэдакцыі № 200700962 у Віцебскім камерцыйным банку (Віцкамбанк). Код (МФО) банка 150801701.

Газета набраная і надрукаваная афсетным спосабам у Віцебскай узбуйненай друкарні імя Камінтэрна: г. Віцебск, вул. Шчарбакова-Набярэжная, 6.

Выдаецца з кастрычніка 1991 г.

Выходзіць штотыднёва па серадах

Нумар падпісаны да друку 24.08.1993 г. у 17.15.

Наклад 1500 экз.

Кошт 5 руб.